ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 84 (1353) | НЯДЗЕЛЯ, 12-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАНЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

ДА ВЕДАМА УСІХ ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ МЕНГАРКОМУ, СЭКРАТАРОЎ К-ВАЎ І ЯЧЭЕК МЕНСКАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ ЛКСМБ

22-га красавіка а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні залі пасяджаньняў Гаркому КП(б)Б склікаецца

пашыраны пленум Менгаркому ЛКСМБ.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Аб стане паходу гарадзкой організацыі КСМ за аўладаньне тэхнікай (дакл. Хайман).
2. Аб рабочым забясьпечаньні (дакл. Руніцкі).
3. Аб задачах саветаў у колгасным будаўніцтве (дак. Янковіч).
4. Аб становішчы комсамольскай работы ў ВУЗ'ах і тэхнікумах (дакл. Фрумкіна).

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ ЯНКОВІЧ.

Напярэдадні другой гадавіны соцыялістычнага спаборніцтва

Кожны комсамолец—ударнік—кожны малады ўдарнік—комсамолец

Ніводнага маладога рабочага па-за радамі ўдарных брыгад

(З ПАСТАНОВЫ МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ)

Для пасьпяховага выкананьня гіганцкіх плянаў соцыялістычнага будаўніцтва краіны Саветаў комсамол высунуў новыя формы і мэтоды соцыялістычнай організацыі працы—соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва за два гады стала рухам мільённых мас рабочых і працоўных Саюзу нябачаным магутным вагаром ў барацьбе за 5-ці годку ў 4 гады, за генэральную лінію партыі.

Гэта забясьпечвае магчымасьць цалком выканаць пастаўленыя перад намі партыяй задачы пераключыць соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, як мэтод комуністычнай організацыі працы, на вышэйшую ступень.

Ленінскі комсамол Меншчыны павінен азначыць другую гадавіну соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ўздымам магутнае хвалі ўдарніцтва, паляпшэньнем якасьці ўдарнае працы, яшчэ большым пераключэньнем організацыі па аўладаньні вышынямі навукі і тэхнікі, што настойліва прад'яўляюцца нам задачамі 3-га, рашаючага году 5-цігодкі.

Бюро Гаркому пастанаўляе:

У азнаменаваньне другой гадавіны соцспаборніцтва, абвясьціць па горадзе і раёне вытворчую пераклічку паміж колектывамі і ячэйкамі ЛКСМБ.

> **Усім колектывам і ячэйкам ЛКСМБ і раёну неабходна правесьці да 15-га красавіка па ўсіх фабрыках і заводах, саўгасах, колгасах, савецкіх і навучальных установах мітынгі, на якіх папулярызаваць дасягненьні прадпрыемстваў, мобілізуючы масу на 100 проц. ахоп усіх рабочых, служачых, саўгасьнікаў, колгасьнікаў і ўсіх працоўных соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам.**

Неабходна дабіцца, каб кожная ўдарная брыгада была маленькім ВТУЗ'ам для дэталёвага вывучэньня машын, матар'ялаў, плянаў брыгад, цэху, усяго заводу. На аснове ўсяго гэтага дабіцца масавага ўдзелу ўдарнікаў у рацыяналізацыі прадпрыемстваў і ўстаноў. ...аручыць эконом- масаваму аддзелу, сумесна з штабам спэцыялістых НДІ, зараз-жа пераключыць усіх спэцыялістых гораду на конкрэтную дапамогу організацыям комсамолу ў паходзе за тэхніку.

Адзначаючы, што соцспаборніцтва і ўдарніцтва, як комуністычны мэтод працы, не знайшлі належнага праламленьня ў саўгасах і асабліва ў колгасах нашага раёну, прапанаваць усім ячэйкам ЛКСМБ саўгасаў і колгасаў разгарнуць масавую кампанію па організацыі соцспаборніцтва і ўдарніцтва, ства...аючы ўдарныя комсамольскія брыгады сумесна з беспартыйнай моладзьдзю, якія павінны стаць на чале ліквідацыі ўсіх прарываў, і абвясьціць шырокую барацьбу прагулам і спазьненьням.

Прапанаваць вытворчым колектывам і ячэйкам ЛКСМБ, шэфам колгасаў і саўгасаў, правесьці сумесныя сходы вытворчых, саўгасных і колгасных ячэек ЛКСМБ, шырока прыцягнуўшы моладзь і дарослых працоўных з мэтай перадаць ім фабрычна-заводзкі вопыт.

28-га красавіка 1931 году правесьці па ўсіх клюбах, ленкутках, хатах-чытальнях і г. д. вечары ўдарнікаў, прысьвечаныя другой гадавіне соцспаборніцтва.

29-га красавіка правесьці агульна-гарадзкі зьлёт старэйшых ударнікаў з комсамольцамі, на гэтым зьлёце паставіць даклад аб стане прамфінпляну і прэміяваньні лепшых ударнікаў. Зараз-жа вылучыць пэўны лік удзельнікаў зьлёту для кожнага прадпрыемства, деталёва абгаварыўшы кандыдатуры дэлегатаў.

Прамполітбой ёсьць генэральная праверка асвоеньня комсамолам Меншчыны рашэньняў 9-га і 10-га зьездаў КСМ у разрэзе п[ра]ктычнага праламленьня іх ў штодзённым жыцьці, таму ён павінен стаць магутным сродкам барацьбы з адмоўнымі зьявамі ў соцспаборніцтве і ўдарніцтве, адначасова значна палепшыць якасьць ударнае працы. Прамполітбой трэба скарыстаць, як трыбуну для масавай перадачы вопыту лепшых прадпрыемстваў

АДКАЗ ЯПОНСКАГА УРАДУ на ноту протэсту СССР

МАСКВА. У ноце, уручанай т. Траяноўскаму 7 красавіка, японскі ўрад выказвае жывое спачуваньне з прычыны замаху на т. Анікіева і прыводзіць данныя аб ходзе следзтва і паказаньні рабіўшага замах на забойства т. Анікіева Сато.

Японскі ўрад адмаўляе сувязь паміж замахам і тэй варожай кампаніяй, якую японскія рыбапрамысловцы вялі супроць СССР. Японскі ўрад падкрэсьлівае таксама, што ён не прадбачыў, што адбудзецца акт гвалту, падобны таму, які меў месца, калі праз японскага пасла ў Маскве папярэджваў савецкі ўрад аб магчымасьці эксцэсаў з боку японскіх рыбапрамысловцаў. З прычыны протэсту савецкага ўраду, у сувязі з тым, што японскія ўлады ня былі прынялі дастатковыя меры для абароны т. Анікіева, японскі ўрад заяўляе ўсё ж, што ён горача шкадуе, што замах, нечаканай ахвярай якога быў т. Анікіеў мог мець месца, ня гледзячы на усе меры, якія прымаў японскі ўрад. У далейшым паведамляецца, што рабіўшы замах на забойства Сато адданы суду па абвінавачваньню ў замаху на забойства. Справа знаходзіцца зараз ў папярэднім следзтве, пасьля высьвятленьня якое, ён будзе строга пакараны, згодна законам Японіі.

У заключэньне японскі ўрад заяўляе, што хаця ён і мяркуе, згодна паказаньняў злачынцы, што гэта ізоляванае злачынства, адвак само сабой зразумела, што калі будуць устаноўлены супольнікі і іншыя падбухторшчыкі, дык яны таксама будуць асуджаны, згодна законам Японіі.

Японскі ўрад запэўнівае савецкі ўрад, што калі справа ідзе аб тым, каб не дапусьціць паўтарэньня інцыдэнту гэтага роду, японскі ўрад гатовы прыняць усе неабходныя меры, якія толькі будуць магчымы.

Усесаюзная нарада Асоавіяхіму скончылася

МАСКВА.— Усесаюзная нарада Асоавіяхіму на рабоце на вёсцы скончыла сваю работу. Нарада распрацавала рад конкрэтных мерапрыемстваў па ўмацненьню асоавіяхімаўскай работы, галоўным чынам у агранізаваных сэктары сельскае гаспадаркі. Нарада ў рэзолюцыі адзначае, што рост аграмадажанага сэктару сельскае гаспадаркі стварыў выключна спрыяючыя ўмовы для разгортваньня асоавіяхімработы.

Справа Палянскага—зьвяно ў падрыхтоўцы антысавецкай інтэрвэнцыі

ВАРШАВА, 10.—Праст[о]рныя справаздачы, якія публікуюцца польскім друкам аб процэсе Палянскага, імкнуцца да адная мэты: змазаць сутнасьць справы і абмаляваць Палянскага ня то крымінальным злачынцам, ня то „провокатарам савецкай службы“. Суд та[к]сама стараецца абыйсьці палітычныя моманты, таму што процэс вядзецца, як простая крымінальная справа. Пасьля таго, як камісар палітычнай паліцыі Галчынскі зрабіў допыт, абарона ўносіць прапанову аб тым, што суду неабходна выехаць на месца злачынства „для дакладнага ўстанаўленьня ўсіх акалічнасьцяй справы, у прыватнасьці месц, дзе, па словах Палянскага, быў перарэзаны электрычны провад“.

Прапанову абароны падтрымлівае абвінавачваньне. Крыжавым допытам сьведак М[а]хая і Галчынскага ўстанаўліваецца—ня гледзячы на ўсе с[п]робы Палянскага і яго абаронцаў абвергнуць гэта—што электрычны провад быў перарэзаны Махаем ня ў трох месцах, а толькі ў двух. Гэта абвяргае сьцьверджаньні Палянскага, быццам ён перарэзаў провад. На першае пытаньне суда: ці мог быць пры данай пабудове адзкай машыны выбух, экспэртыза дае адказ: „але, выбух змагчыма мог“. На другое пытаньне: якія руйнаваньні зрабіў-бы выбух, экспэртыза адказвае:—„выбух азбурыў-бы сьцяну шырынёю 60 сантымэтраў з радыусам дзеяньня выбуху ў некалькі мэтраў“. У адказ на адну з рэплік Палянскага экспэрты зазначылі, што знарад быў бязумоўна прыгатаваны першаклясным спэцыялістым гэтай справы.

ВАРШАВА, 10. Цэнтральным момантам другога дня процэсу Палянскага была экспэртыза. Суд пасьпеў ужо выслухаць думку ўсіх экспэртаў. Экспэртыза ўстанавіла, што адзкая машына была пабудавана зусім мэтазгодна і выбух мог адбыцца. Порах быў у здавальняючым становішчы. Снарад быў пастаўлен так, што зьмешчаны ў ім порах набываў уласьцівасьці аналёгічныя з уласьцівасьцямі дынаміту, хаця і з меншай сілай в буху. Ударнік сконструяваны так, што выбух павінен быў адбыцца. Электрычная праводка была дастатковая для таго, каб выклікаць выбух. За ана ў гадзіньнікавым мэханізьме тлумачыцца тым, што мэханізм быў зьняты ў часе дастаўкі яго экспэртам. У пытаньні аб магчымым дзеяньні выбуху, экспэрты правілі пэўную стрыманасьць і паказалі, што сіла яго была-б ня надта вялікая.

Экспэрт Абалчынскі заявіў, што па яго думцы, дом пасольства ня быў-бы зруйнаваны, моглі папярпець толькі тыя асобы, якія блізка знаходзіліся ад места выбуху.

Затым суд дапытваў сьведкаў, выкліканых абаронай, з мэтай ўстанавіць нібы Палянскі падрыхтаваў замах выключна з мэтай дэмонстрацыі. Сьведка Лебедзеў заяўляе, што Палянскі гаварыў яму аб неабходнасьці ўтварэньня саюзу, які павінен дабівацца ў дзяржаў высылкі савецкіх пасольстваў.

Пасьля двух дзён процэсу Палянскага ўжо ёсьць некаторая магчымасьць ацаніць палітычны бок процэсу. Ужо выпарылася вэрсыя аб „комуністычнай дзейнасьці“ Палянскага. Сьцьвярджаць гэта не адважваецца ні абвінавачаньне, ні абарона, ні сам Палянскі. Наадварот Палянскага стараюцца прадставіць дурачком, мяккацелым хрысьціянінам. Што датычыцца фактычнага боку справы, дык суд адмовіўся ад вэрсіі, што падрыхтоўваемы выбух быў толькі жартам і дэмонстрацыяй. Канчаткова устаноўлена, што выбух меркаваўся усур'ёз.

Ні для кога ў залі ўжо няма сумненьняў, што Палянскі наймiты выканаўца нечыей волі. Але прокурор і суд усяляк абыходзяць якраз момант ажыцьцяўленьня супольнікаў і організацыі, паслаўшай на гэтую справу Палянскага, ажыцьцяўленьне якіх не адмаўляе нават абаронца.

Устаноўлены бясспрэчна факт, што гадзіньнікавы мэханізм быў у руху, ня выклікаў ніякага інтарэсу з боку прокурора. Між тым, даказана, што уся праводка была закончана за тыдзень да таго, як яе выкрылі і праз некальkі дзён пасьля ад'езду Палянскага з Варшавы. Адсюль відаць, што ёсьць чалавек, які пусьціў у рух гадзіньнікавы мэханізм, што заводзіўся толькі на 36 гадзін. Прокурор палічыў неабходным вяла задаць пытаньне адкуль чэрпаў Палянскі сродкі на падрыхтоўку замаху. Сьведка—комісар палітычнай паліцыі, заявіў, што Палянскі перад ад'ездам у Варшаву прадаў свой ложак за 15 злотых і радыёпрыёмнік. Між тым, нават, згодна абвінаваўчага акту, на адну ўстаноўку адзкай машыны Палянскі страціў 175 злотых, ня лічучы выдаткаў на ўцекі ў Юга-Славію. Характэрна, што надзвычайна жабрацкае матар'яльнае становішча Палянскага ў некаторы пэрыод, даказанае мноствам паказаньняў сьведкаў, у апошні час перад замахам рэзка зьмянілася ў бок палепшаньня. Справа тоне ў нязначных падрабязнасьцях і нікому непатрэбных паказаньнях сьведкаў, накіраваных у бок дасягненьня адной мэты: змазваньня палітычнай сур'ёзнасьці справы і выхалашчваньня палітычнага зьместу процэсу. На данай стадыі процэсу міжвольна ўзьнікае апаска, што пасьля няўдач выкарыстаць процэс у чыста провокацыйных мэтах, будзе зроблена спроба зрабіць яго нясур'ёзным, сьмехатворным.

Рэзюмуючы вынікі першых двух дзён процэсу, неабходна падкрэсьліць, што суд і прокуратура праяўляюць яўна тэндэнцыйнае роўнадушша да высьвятленьня сапраўдных абставін замаху.

Стачка тэкстыльшчыкаў ва Францыі

ПАРЫЖ, 9.—Учора па заклiку цэнтральнага камітэту барацьбы пачалася стачка тэкстыльшчыкаў у Труа і Ромільлі (дэпартамэнт ОБ). Забастоўка абвешчана ў адказ на рашэньні прадпрыемцаў зьнізіць зарплату. Скарачэньне зарплаты на 8 проц. для рабочых і 6 проц. для работніц—павінна было закрануць 35 тысяч тэкстыльшчыкаў. Дакладная лічба бастуючых невядома. „Юманітэ“ называе некальkі тысяч чалавек.

„Маладая гвардыя“—у Кітаі

БЭРЛІН. Як паведамляюць з Кітаю, у савецкіх раёнах Кітаю комсамолам створана падобная масавая організацыя працоўнай моладзі, пад назвай „Маладая гвардыя“. У розных савецкіх раёнах яна налічвае каля 100 000 батрацка-бядняцкай і серадняцкай моладзі.

Забастовачны фронт нямецкіх будаўнікоў

БЭРЛІН 8.—Забастоўка нямецкіх будаўнічых рабочых, якая пачалася пад кіраўніцтвам рэволюцыйнай профопозыцыі, сёньня значна пашырылася і ахапляе ўсё больш лік рабочых ня толькі у Бэрліне, але і ва ўсёй астатняй Нямеччыне. У Бэрліне ў сучасны момант бастуе 10000 будаўнічых рабочых, у выніку чаго работа на ўсіх буйных пабудовах прыпынена. Забастоўка расьце асабліва ў Саксоніі, у Шлезьвіг-Гольштыніі, Дюрынгіі і ў Рурскай абласьці, дзе бастуе яшчэ болей значны лік рабочых, чым у Бэрліне.

Пашыраюцца забастоўкі будаўнічых рабочых Нямеччыны

БЭРЛІН. 10.—Забастоўка будаўнічых рабочых, якою кіруе рэволюцыйная профопозыцыя, пашыраецца. У Гамбургу рэформістыя спрабавалі схіліць рабочых да 15 красавіка працягваць перагаворы з прадпрымцамі. Рабочыя адхілілі прапанову рэформістых. Учора на 24-х пабудовах 1.500 рабочых, па заклiку рэволюцыйнай профопозыцыі, абвясьцілі забастоўку.


Па апошніх вестках, у Рурскай вобласьці бастуюць 15.000 будаўнікоў. У Штутгарце, ня гледзячы на спробы рэформісцкіх лідэраў сарваць забастоўку, барацьба працягваецца. Далучыліся да забастоўкі будаўнічыя рабочыя Хэмніца і Цьвікаў. Сёньня чакаецца забастоўка рабочых розных будаўнічых фірмаў у Бадэне. Забастоўка ў Гальле працягваецца з тым жа ўздымам.

БЭРЛІН, 10. З усіх частак Нямеччыны прыходзяць паведамленьні аб пашырэньні забастоўкі будаўнічых рабочых і аб першых дасягнутых посьпехах. Забастовачны фронт пашырыўся ў Саксоніі. У акрузе Магдэбург-Ангальт абвешчан лёкаут усіх будаўнічых рабочых. У шэрагу фірм у Рэйнска-Вэстфальскай акрузе і Золінгене прадпрымцы выказалі згоду захоўваць ранейшыя стаўкі. У Бад-Крэйцнаху забаставала большасьць будаўнічых рабочых.

Падрыхтоўка к 1-му Мая ў Польшчы

ВАРШАВА, 10. У сувязі з падрыхтоўкай к 1-му Мая комуністыя актыўна разгарнулі агітацыю ў рабочых раёнах. На сьценах дамоў расклеены плякаты і адозвы. На некаторых вуліцах на тэлефонных провадах былі вывешаны рэволюцыйныя лёзунгі.

Рыхтуйцеся да Ўсебеларускай чыгуначнай нарады



СЕНЬНЯ СЛОВА МАЕ ВОРША

22-га красавіка пачынае сваю працу першая Ўсебеларуская конфэрэнцыя моладзі чыгункі.

Конфэрэнцыя павінна будзе праверыць, наколькі комсамольскія організацыі і чыгункі перабудовалі сваю працу ў адпаведнасьці з задачамі, высунутымі адозвай ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, наколькі барацьба за рэалізацыю гэтай адозвы стала вузлавым, стрыжнёвым пытаньнем штодзённай дзейнасьці комсамольскай організацыі.

Зьмяшчаючы першы матар'ял аб дзейнасьці аршанскай комсамоліі, яе посьпехах і недахопах у барацьбе за спараную язду, здаровы паравоз, працоўную дысцыпліну, мы чакаем ад комсамоліі Менску, Віцебску і Жлобіну, што яна раскажа нам аб сваім вопыце ў барацьбе за бальшавіцкі транспорт, за ўдарны транспорт, адпавядаючы тэмпам 3-га, рашаючага.

У БАРАЦЬБЕ ЗА ЗДАРОВЫ ПАРАВОЗ

Адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб чыгуначным транспорце комсамольская організацыя станцыі Ворша распрацавала разам з партыйным камітэтам.

У выніку абгаварэньня адозвы, станцыйны камітэт комсамолу разгарнуў шырокую работу па разьвіцьцю соцспаборніцтва і ўдарніцтва на вытворчасьці. Уся ўвага была мобілізавана на барацьбу за выкананьне вымернікаў, на барацьбу за здаровы паравоз.

Узоры самааддданай працы

У дэпо комсамольская ячэйка стварыла дзьве ўдарныя брыгады, з якіх адна на абточцы, а другая на консэрвацыі.

Гэтыя ўдарныя брыгады ўпісалі слаўную старонку ў гісторыю барацьбы комсамолу за якасьць, за зьніжэньне сабекошту, за здаровы паравоз.

У час, калі на абточцы паравозаў прарыў, калі ва ўсіх брыгадах недавыкананьне вымернікаў, у гэты час складаецца ўдарная брыгада з 8-мі комсамольцаў і паказвае ўзоры самааддданай бальшавіцкай працы.

У выніку правільнай расстаноўкі сіл, творчага энтузіязму працоўных, паравоз выпускаецца з абточкі за 12 гадзін 28 хвілін.

Гэтае дасягненьне ўзварушыла ўсю масу рабочых. Старыя рабочыя таксама складаюць ударныя брыгады па рамонту паравозаў і бяруцца дамагчыся лепшых паказчыкаў.

На вытворчасьці ўздым. Кіпіць соцыялістычнае спаборніцтва. Кожны рух рабочага вывераны. Брыгада старых рабочых выпускае паравоз за 12 гадзін і 12 хвілін.

Такім чынам, комсамольская ячэйка ўліла жывы струмень. Узьнялася соцыялістычная організацыя працы, запаліліся энтузіязмам рабочыя.

24 замест 72

Ударныя брыгады комсамольцаў на консэрвацыі паравозаў уступілі ў соцыялістычнае спаборніцтва з групай планавага рамонту.

Абавязкі, узятыя на соцспаборніцтву, выкананы. Замест 72 гадзін, паравоз выпускаюць за 24 гадзіны. Раней, да адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР на консэрвацыі паравозаў былі прастоі па 7-10 дзён. За два месяцы брыгада зьнізіла сабекошт.

За добрую работу адміністрацыя прэміявала ўсю брыгаду павышэньнем разрадаў.


Барацьба за ліквідацыю прарываў захапіла брыгады. Комсамольцы ўпарта змагаюцца за выкананьне вызначаных вымернікаў. Былі выпадкі, калі брыгада працуе ня сем гадзін, а 12 і навет больш. Здараліся і так, калі неабходна было тэрмінова выпусьціць цягнік, брыгада працавала круглыя суткі.

Паздаравелі паравозы...

На ліквідацыю абязьлічкі і ўвядзеньне спаранай язды, усе рабочыя, машыністыя і памочнікі, адгукнуліся організацыяй спараных брыгад. Комсамолія Воршы організавала дзьве спараныя брыгады і прымацавала іх да паравоза.

Усе астатнія комсамольцы прымацаваны да паравозаў.

У выніку праробленай работы па аздараўленьню паравозаў, мы маем зьніжэньне проценту хворых паравозаў.



Загудзіць па рэйках здаровы паравоз.

Палепшыўся догляд за паравозамі як з боку комсамольцаў, так і наогул паравозных брыгад. Ужо машыністыя і памочнікі ня толькі прысутнічаюць, пры рамонце свайго паравозу але і дапамагаюць рамантаваць.

Паміж спаранымі брыгадамі складзены соцумовы. Складзены брыгады па кантролю за якасьцю рамонту паравозаў, у выніку значна зьнізіліся паўторныя рамонты.

З 12-га лютага па 12 сакавіка камітэт комсамолу правёў месячнік штурму. За гэты час кожны комсамолец-паравозьнік адпрацаваў на рамонце паравозаў па 16 гадзін.

На зьлёце ўдарнікаў чыгуначнага вузла, які быў склікан станцыйным камітэтам, падведзены вынікі праробленай работы, прэміявалі 10 ударнікаў і брыгаду паравоза Щ. 460, які ад прамыў ня меў ніякага рамонту.

Побач з усімі дасягненьнямі ў працы комсамольскай організацыі па рэалізацыі адозвы УсеКП(б) і СНК, ё таксама па ажыцьцяўленьню пастаноў Усесаюзнай транспортнай нарады ў практыцы Аршанскага вузла было шмат недахопаў.

Ні ў адной комсамольскай ячэйцы няма плянава-опэрацыйнае групы. Ячэйкі ня прымаюць ніякага ўдзелу ў зборы рабочых прапаноў. А лічбы гавораць аб тым, што на фронце збору рабочых прапаноў па вузьле ня зусім добра.

За два гады і тры месяцы 1931 году на цягавай гаспадарцы, дзе працуе 464 рабочыя, прынята толькі 71 прапанова. З іх ня выканана 15 і адкладзена 8. Гэта зноў такі ўскладае адказнасьць на бюро камітэту за слабое кіраўніцтва рацыяналізатарскім рухам моладзі.

У ячэйцы станцыі на 24 комсамольцы толькі 5 ударнікаў. Комсамольская організацыя станцыі Ворша праводзіла на вузьле транспортную эстафэту, але не закончыла яе.

Дабіцца пералому

Калі на агульным вузлавым сходзе ЛКСМБ ад 17-II—г. г. стала пытаньне аб выніках рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і СНК, было адзначана, што ў рабоце вузлавой комсамольскай організацыі да гэтага часу не наглядаецца належнага пералому ў сэнсе фактычнага выкананьня гэтых пастаноў.

Быў скліканы сход, на якім абгаварвалі ўсе недахопы і вызначалі шляхі для іх зьнішчэньня.

20-III—г. г. на бюро РК стаяла пытаньне аб рабоце колектыву вузла, у сувязі з рашэньнямі ЦК УсеКП(б) і СНК СССР, дзе бюро камітэту была вынесена вымова. Бюро РК жорстка асудзіла недахопы і прабелы ў рабоце організацыі, дала конкрэтны наказ і напрамак для далейшай дзейнасьці камітэту.

Трэба яшчэ адзначыць і тое, што вынікі працы спараных комсамольскіх брыгад па выкананьню вымернікаў прабегу не аб-гаварваліся ні на сходзе ячэйкі, ні камітэтам.

Вучот працы па соцспаборніцтву і ўдарніцтву пастаўлен вельмі дрэнна. Пераход на вучот работы па балавай сыстэме (вопыт ударнікаў станцыі ЗІМА) абгаварваўся, але ніякіх вынікаў да гэтага часу няма.

Дамагацца штодзённай праверкі

Камітэтам комсамолу быў скліканы зьлёт ударнікаў, дзе ўдарнікі ўзялі на сябе рад конкрэтных абавязкаў. Але конкрэтнага зроблена яшчэ вельмі мала.

За выкананьне даручанай работы на вузьле няма адказнасьці. Мы яшчэ ня бачым сталай дысцыпліны сярод комсамольцаў, часам заўважаюцца выпадкі прыкрых спрэчак паміж імі.

Дрэнна пастаўлена сярод чыгуначнікаў вайсковая праца. Толькі ў вучкомбінаце яна неяк праводзіцца.

Інтэрнацыянальнае выхаваньне ў ячэйках пастаўлена з рук вон дрэнна. Не на належнай вышыні яшчэ беларусізацыя.

Рост комсамольскай організацыі на вузьле ішоў самацёкам. З 1525 чалавек моладзі, комсамольцаў толькі 453. За тры месяцы вырасьлі на 116 чалавек. Гэта лічба зусім недастатковая. Ёсьць ячэйкі, як, напрыклад, ФЗВ, якая вырасла толькі на 15 чалавек і рад іншых.

З такім багажом комсамольская організацыя Аршанскага вузла прыходзіць да Усебеларускай нарады. Надалей перад ёю паўстаюць яшчэ больш цяжкія задачы па барацьбе за бальшавіцкі транспорт, за ліквідацыю тых прарываў, якія яшчэ ёсьць на вузьле. Лепшы вопыт з працы Аршанскага вузла павінны падхапіць і скарыстаць астатнія комсамольскія організацыі чыгуначнага транспорту.

М. Тарлоўскі.

Ніводнага колгасу, саўгасу і МТС без насьценгазэты

Безадкладна ўключыцца ў самаправерку нізавога друку

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ аб уключэньні комсамольскіх організацый ў масавы агляд-самаправерку працы нізавога друку)*

За апошнія гады, у цеснай сувязі з бурнымі тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва, праходзіў буйны як палітычны, так і організацыйны рост рабсельнораўскага руху. Арм'я рабсельнораў за першыя гады 5-цігодкі паказала сябе як агітатар і організатар працоўных мас у барацьбе за генеральную лінію партыі, у барацьбе за выкананьне 5-ці годкі.

Надаючы вялікае палітычнае значэньне далейшаму ўзмацненьню рабсельнораўскага руху, бюро ЦК КП(б)Б высьціла масавы агляд—самаправерку працы нізавога друку.

Выходзячы з гэтага, бюро ЦК ЛКСМБ, па пытаньню ўдзелу комсамолу ў масавым аглядзе-самаправерцы нізавога друку і ў падрыхтоўцы да Усебеларускага зьезду рабселькораў, абавязвае ўсе ГК і РК ЛКСМБ:

1) Тэрмінова ўключыцца ў правядзеньне агляду-самаправерку нізавога друку, які павінен прайсьці пад лёзунгам яшчэ большага ўзмацненьня ролі нізавога друку ў організацыі рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад савецкай краінай.

2) Зараз-жа на ўсіх прадпрыемствах, у саўгасах, колгасах, МТС і паасобных брыгадах організаваць брыгады па агляду працы насьценгазэт і шматтыражак і кіраўніцтва нізавым рабселькораўскім актывам, прыцягнуўшы да гэтае справы ўсіх юнкораў, сьценкораў, комсамольцаў і беспартыйную моладзь.

Адначасова праверыць, які ўдзел прымае комсамольская організацыя ва ўзмацненьні ролі нізавога друку і ў кіраўніцтве юнкор. рухам.

3) Дабіцца, каб лёзунг: „Кожны юнкор—ударнік, кожны ўдарнік—юнкор" быў поўнасьцю ажыцьцёўлены, організуючы ўдарныя юнкораўскія брыгады для ўзмацненьня працы насьценгазэт.

4) Зараз-жа практычна прыступіць да правядзеньня ў жыцьцё пастановы ЦК УсеКП(б) і адозвы „Чырвонай Зьмены" да ўсіх комсамольскіх ... нізавы друк, так і кожны с... се, колгасе, МТС, у паасобных бр... работы лепшых, палітычна адукава... комсамольцаў-ударнікаў.

5) Разгарнуць на ўсіх прадпр... ствах, саўгасах, колгасах, МТС, ... саветах шырокую распрацоўку ... Усесаюзнай нарады ... сельнораўскай, для чаго склікаць агул... гарадскія і раённыя сходы комсам... скай і беспартыйнай моладзі па ... таньню аб выніках У Усесаюзнай ... рады рабселькораў, увязваючы ... вараньне гэтага пытаньня з выра... цам канкрэтных мерапрыемстваў ... узмацніць удзел комсамолу ў ... і рабселькораўскім рух...

6) З 15-га па 15-е правесьці месячнік ... рабкораў і шматтыраж... Усім ГК і РК зараз-жа разгарнуць ... прадпрыемствах, у колгасах, саўга... чальную працу аб палітычнай ... саветах гэтай кампаніі, увязваючы ... вядзеньне гэтага месячніку з агляд... нізавога друку, разгортваньнем ... сельнораўскага руху і падрыхтоў... да ўсебеларускага зьезду рабселькор...

7) У азнаку юбілею ... „Чырвоная Зьмена" выпусьц... актыўных юнкораў-комсамольцаў ... адказную газэтную працу. Даручы... агітпропу ЦК ЛКСМБ і ... „Чырвонай Зьмены" распрац... разьвёрстку па гаркомах і райком...

8) Даручыць Оргаддзелу ЦК ЛКСМ... выпусьціць 5 брыгад у раёне для ... па нізавога друку і праверыць як ... руюць комсамольскія організацыі ... кор. рухам.

9) Заслухаць на бюро ЦК ЛКСМ... даклады 2-х гаркомаў і 3-х райком... ЛКСМБ аб стане разгортваньня ... завога друку на месцах і кіраўніцт... юнкор-рухам і садаклады брыгад ... ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены"

10) Абавязаць газэту „Юнгер А... байтэр" і „Піонэр Беларусі" ўкл... чыцца ў агляд-самаправерку нізаво... друку.

11) Прапанаваць ЦБ ЮП распр... цаваць мерапрыемствы для ўключэньн... піонэрскай організацыі ў агляд-сам... праверку нізавога друку.

*) Па віне выпушчаючага і друкарні была зьмешчана толькі палова гэтае пастановы.

Сёньня пастанова зьмяшчаецца поўнасьцю.

Больш увагі насьценгазэтам

Петрыкаўская профтэхшкола агнятрывалага будаўніцтва ўключылася ў правядзеньне месячніку за 60-тысячны тыраж „Ч. З." Вынесена пастанова аб 100 проц. ахопе падпіскай і чытаемасьцю „Чырвонай Зьмены" профтэхшкольцамі.

Для лепшай сувязі „Ч. З." з сваімі юнкорамі, я ўношу прапанову, каб „Ч. З." у далейшым больш асьвятляла працу насьценгазэт, адвёўшы для гэтага ў газэце асобны куток, дзе-б даваўся правільны напрамак у працы. Гэтыя мерапрыемствы дасьць магчымасьць узьняць на належную вышыню працу насьценгазэт.

Каманецкі.

Райкомам ЛКСМБ: Гомель, Жлобін, Ворша, Віцебск, Менск, Магілеў, Бабруйск, Барысаў, Мазыр, Полацак і прадстаўніком моладзі пры Райпрофсачах

Усебеларуская транспартная нарада моладзі, прызначаная на 15-е красавіка 1931 году, пераносіцца на 22-е красавіка, з прычыны непадрыхтаванасьці паасобных організацый. Зараз-жа на падставе раней дадзеных дырэктыў скончыць перабудову комсамольскіх організацый на чыгунцы і тэрмінова разгарнуць працу па падрыхтоўцы і прысылцы на нараду ў ЦК ЛКСМБ, якія б характарызавалі становішча работы комсамольскай організацыі свайго вузла.

Масава-Экономічны Аддзел ЦК ЛКСМБ Юрк'янец.

Прадстаўнік ЦК ЛКСМБ у Белбюро ЦК чыг. Малей.

БАЯВЫМ ШТУРМАМ АХОПЛЕН ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН

Колгас „Чырвоны Араты" і „КІМ" рапартуюць: кожны плуг, барана на чаку!

ШЫРЭЙ ФРОНТ БАРАЦЬБЫ: ЗА НОРМУ ВЫПРАЦОЎКІ, ЗА РАСЦЭНКУ Ў ПРАЦАДНЁХ, СУПРОЦЬ АБЯЗЬЛІЧКІ, ЗА 100 проц. КАНТРАКТАЦЫЮ ЯРАВЫХ

НА БАРАЦЬБУ ЗА БАЛЬШАВІЦКУЮ

3-ці пленум Лельчыцкага РК ЛКСМБ абвясьціў сябе мобілізаваным на правядзеньне абвешчанага ЦК ЛКСМБ месячніку баявой вясеньняй трывогі і праверкі падрыхтаванасьці да вясеньняй сяўбы.

Складзены брыгады з комсамольцаў, колгасна-батрацкай і бядняцка-серадняцкай моладзі. Брыгады разгарнулі праверку падрыхтаванасьці колгасаў і аднаасобнага сэктару да сяўбы і організуюць новыя колгасныя прыліў.

Па колгасах і вёсках праводзяцца сходы колгасна-батрацкай, бядняцкай і серадняцкай моладзі па распрацоўцы рашэньняў 3-га ўсебеларускага зьезду колгасаў, усесаюзнага зьезду саветаў і адозвы СНК і ЦК аб кантрактацыі яравых пасеваў.

Брыгады па-ўдарнаму разгарнулі работу па ачыстцы насеньня, праверцы падрыхтаванасьці насенных і фуражных фондаў, рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара і збору попелу.

У політ-гуртках і школах уводзяцца гадзіны вывучэньня агра-зоотэхнікі. Пастаўлена задача—у кожным колгасе організаваць комсамольскую ячэйку. Комсамольскія ячэйкі колгасаў узялі шэфства над зборамі для лепшага захаваньня і гадоўлі маладняка.

Пры дапамозе спэцыялізаванай брыгады „Ч. З." організавана ўдарная юнкораўская брыгада імя „Чырвонай Зьмены" для практычнай дапамогі комсамольскім ячэйкам.

Па ўсіх сельсаветах організоўваюцца юнкораўскія пасты і брыгады „Чырвонай Зьмены". Да першага красавіка спэцыялізаванай брыгады „Ч. З." разам з райкомам комсамолу організаваны ўдарныя юнкораўскія пасты і брыгады; у мястэчку Лельчыцы, у вёсцы Мілашэвічы, у колгасах „Шлях да соцыялізму", „Інтэрнацыянал", „Чырвоны Араты".

За час працы спэцыялізаванай брыгады „Чырвонай Зьмены" (15 дзён) у Лельчыцкім раёне агульны процант колектывізацыі павялічыўся на 2,1. Праведзена вялізарнейшая работа па падрыхтоўцы колгасаў да вясны і організацыі пробных выездаў у поле.

Хваля баявога штурму ахапіла ўвесь Лельчыцкі раён. Адчуваецца ўдарнасьць і комсамольская напорыстасьць. Комсамолія паказвае сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы, тэмпы трэцяга рашаючага.

Вітоль. Д



Юнкор-організатар

Т. Кундоў, юнкор-ударнік, кіраўнік Лельчыцкай юнкораўскай брыгады імя „10-ці годзьдзя Чырвонай Зьмены". Брыгада ўключылася ў актыўную барацьбу за спэцыялізацыю раёну.

У кожным колгасе юнкораўскі пост ці брыгада

Мы комсамольцы і працоўная моладзь вёскі Мілашэвічы, у дапамогу спэцыялізаванай брыгадзе „Чырвонай Зьмены", якая працуе ў Лельчыцкім раёне, і ў адзнаку 10-цігадовага шляху баявой дзейнасьці „Чырвонай Зьмены",—абвяшчаем сябе ўдарнай юнкораўскай брыгадай імя 10-цігодзьдзя „Чырвонай Зьмены".

Мы абавязваемся праз газэту весьці самую жорсткую барацьбу за генэральную лінію партыі. Будзем з усёй рашучасьцю змагацца за пашырэньне соцыялістычнага сэктару вёскі, будзем організатарамі новага колгаснага прыліву, будзем мацаваць старыя колгасы.

Выклікаем комсамольцаў і беспартыйную працоўную моладзь м. Лельчыцы пасьледваць нашаму прыкладу.

Ашарчук, Кузьняцоў, Рачынскі, Майман, Бабіцкая і Ронкіна.

Лельчыцы адказваюць

У адказ на выклік комсамольцаў і беспартыйнай моладзі в. Мілашэвічы, мы, комсамольцы м. Лельчыцы, у колькасьці 11-ці чалавек (Кемін, Куцанаў, Гольдман, Сідаровіч, Кунаўскі, Гонікман М., Бурштэйн, Гехман, Бобр, Гозман З.)—абвяшчаем сябе ўдарнай юнкораўскай брыгадай газэты „Чырвоная Зьмена".

Адзінаццаць подпісаў

РАЗЬБІЦЬ УЛАДУ САМАЦЕКУ

Ліквідаваць мяса-малочную запазычанасьць

(Ад нашага спэцкора)

Вырашэньне мясной проблемы і разьвіцьцё жывёлагадоўлі па Лельчыцкім раёне ажыцьцяўляецца вельмі марудна. Райкоопсаюз, РВК і РК КП(б)Б ня праявілі патрэбнай гнуткасьці, не мобілізавалі актыўнасьці м с. Бязьдзейнасьць і самацёк—вось што характарызуе працу РВК і Райкоопсаюзу.

Наступіць на кулака

Райвыканком і сельсаветы не разгарнулі кампанію мясазагатовак. Пляны загатовак спушчаны ў нізы толькі 25-га студзеня, у той час, як трэ' было скончыць мясазагатоўкі да першага студзеня.

На першае сакавіка выкананьне гадовага пляну мясазагатовак выражаецца ў наступных лічбах: буйнай рагатай жывёлы загатоўлена 78,0 тон, што складае 49.7 проц., авечак загатоўлена 3,6 тон, ці 50 проц. заданьня, сьвіней —9 проц. заданьня.

Кулацка-заможныя гаспадаркі ня выканалі дадзенага ім цьвёрдага заданьня. РВК і Райкоопсаюз ня ўжылі рашучых захадаў барацьбы супроць кулацкага сабатажу.

Захаваць маладняк!

У раёне, паводле пляну, трэба законтрактаваць цялят 1221 шт., але і на сёньня ніводнае цяля не законтрактавана. Плян контрактацыі цялят нават ня быў уключан у агульны плян мясазагатовак.

Райкоопсаюзы і сельсаветы не вядуць вучоту маладняка (маладняк выразаецца на мяса), ня ўжываюць рашучых захадаў для барацьбы супроць разбазарваньня і зьнішчэньня маладняка.

Контрактацыя малака на раёне сарвана. З 23 колгасаў, толькі з трыма Райкоопсаюз склаў умовы на контрактацыю малака.

Па аднаасобным сэктары ні літра малака не законтрактавана.

Кулацка-заможным гаспадаркам цьвёрдых заданьняў на здачу малака ня дадзена.

Опортуністыя рыхтуюць галодны паёк

З-за безадказных адносін райкоопсаюзаў і сельсаветаў да правядзеньня загатовак, сена і саломы рад колгасаў раёну застаецца бяз корму.

Згодна плянаў, на першае красавіка трэ' было загатовіць больш 600 тон сена і саломы, а на 15-ае красавіка загатоўлена, сена 187 тон і саломы 126 тон.

Лельчыцкі раён—з жывёлагадоўчым ухілам. Гэта вымагае ад усіх раённых організацый перабудаваць сваю работу на баявыя бальшавіцкія тэмпы і выканаць задачу партыі і ўраду па спэцыялізацыі раёну.

Віт. Сідарук.

Рапарт колгасу КІМ

Рытмы працы
вітаюць вясну
Другі сеў,
бальшавіцкі,
На варце!
На разлогі,
мяжу і былльнёг
Вышаў сьмелымі
крокамі
трактар,
Працай ударнай
сустрэнем вясну.
Усё растаўлена...
Поле—ў прагаўках.
Слухай рапарт
колгасьніцы „КІМ"!
Словы цьвёрдыя.
лічбы,
Наталкі:
„Кожны плуг,
барана, на—чаку.
Конь вясёла
памахвае грывай,
Бой рашучы
дамо кулаку
Працай ўдарнай—
колгасным прылівам.
У сэрцы радасьць...
вясновы прывет.
Плянаў лічбы
расчэсваюць масмы,
Будзе трактар
у другую вясну—
Так учора рашыў
сход колгасны".
Гэй, гляды,
На мяжу.
На былльнёг!
Ўзарэм гуртам
колгаснае поле!
Працай ударнай
памножым прыліў,
Каб Наталка
была
ў комсамоле.
Кожны плуг,
барана, на чаку.
Конь вясёла
памахвае грывай,
Бой рашучы
дамо кулаку
Працай ударнай
колгасным прылівам.

С. А. Куцанаў.

М. Лельчыцы.
5-IV—31 г.

Растуць новыя калёны будаўнікоў соцыялістычнай гаспадаркі

Райком комсамолу склаў брыгады вярбоўшчыкаў у колгасы, якія адначасова вядуць працу і па падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны.

Брыгада, якая працавала ў Картынiцкім сельсавеце (вёска Асінская), шырока разгарнула масавую растлумачальную працу сярод бядняцка-серадняцкіх мас і організавала колгас імя „КІМ" з 16 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

На другі дзень пасьля афармленьня колгасу, новыя колгасьнікі пачалі працу па вярбоўцы ў колгасы.

Колгас „КІМ" упаўне падрыхтаваны да вясеньняга севу: прыгатаваны насенны фонд, адрамантаваны інвэнтар. Колгас—у баявой гатоўнасьці да выхаду ў поле. У дні сталінскага заклiку ў колгас уступіла яшчэ 5 гаспадарак, а 4 маладыя колгасьнікі падалі заяву аб уступленьні ў комсамол. Організавана комсамольская ячэйка. Райком комсамолу ўзяў шэфства над колгасам „КІМ", колгас перавёў усю працу на зьдзельшчыну і аплату па працадзёнах і якасьці.

Брыгадзір „Ч. З." М. Е.

„Чырвоны Араты" скончыў падрыхтоўку

Колгас „Чырвоны араты" да другой бальшавіцкай вясны ўжо гатовы. Насенныя фонды па ўсіх культурах сабраны і ачышчаны.

Сельска-гаспадарчы інвэнтар увесь адрамантаваны. У наяўнасьці 20 плугоў, 3 сеялкі і іншы сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Колгас перавёў усю працу на зьдзельшчыну, устаноўлены расцэнкі работ. Організавана чатыры брыгады: па жывёлагадоўлі, плугароў, сейбітаў і баранавальшчыкаў.

Брыгадзір „Ч. З." Журавіч.

ЗАГАД БУДЗЕ ВЫКАНАНЫ

Лёгкі веснавы вецер прывітаў раніцу.

Яшчэ няма васьмі гадзін, а на двары колгасу кіпіць праца.

Брыгады колгасьнікаў аглядаюць інвэнтар, правяраюць кожны вінцік, кожны рычажок.

Усе заняты руплівай падрыхтоўкай да пробнага.

Брыгада баранавальшчыкаў складае на воз інвэнтар, весела выносячы са складу новыя, толькі што купленыя культыватары, драпачы і зыгзагныя бораны, асьцярожна кладучы іх на воз.

Стары колгасьнік—дзед Журовіч, адказны брыгадзір сеяльшчыкаў, першы організатар колгасу, на паседжаньні выхворчай нарады казаў:

— Своячасовы і добны засеў 200 гектараў яравых культур—забясьпечым. Не глядзеце, што ў маёй брыгадзе большасьць старых. Мы бяз бою не здамося і свой абавязак перад дзяржавай выканаем.

З ключом у руках ён клапатліва аглядаў сеялку, правяраючы кожную пружынку, дыск, падкручваючы аслабшыя гайкі.

... Нас ніхто не пераможа

Сёньня ў дзеда Журовіча, як ніколі, гараць вочы. На старым маршчыністым твары разьліваецца глыбокая радасьць, радасьць магутнага ўздыму і пераможнасьці.

Дзед гаа вою стаіць за колгас. На агульным сходзе ён, разьбіваючы агідную кулацкую хлусьню, сівы Журовіч сказаў:

— Я пераканаўся на справе, што толькі колектыўная гаспадарка вызваліць бедняка з галечы. І цяпер няхай хто што робіць, а я з колгасу НЯ ВЫЙДУ і аднаасобнікам ня буду.

Да дзеда Журовіча надышла піонерская брыгада. Ён вясёлай усьмешкай прывітаў яе, з любоўю пазіраючы на новыя рычажкі сеялкі. Піонэры жыва пачапілі на дзедаву краёную—сеялку лёзунг:

„За другі бальшавіцкі сеў".

— Так. так, каткі! За другі бальшавіцкі За наш кроўны, родны сеў, сеў магутны, ераможны. Зараз мы ўжо моцныя і ніякім там кулацкім вантробам ня супыніць колгаснага руху, бегу другой бальшавіцкай...—любуючыся гатовай да севу сеялкай прагаварыў дзед.

Сыгна . Увесь колгас на нагах. Кожная брыгада заняла сваё месца. Усё гатова. Кранулі. Падуў прывет... вясеньні ветрык...

Комсамольская ўдарная брыгада плугароў імя X годзьдзя „Чырвонай Зьмены" зацягнула марш Будзёнага, падхапляючы задорную прыпеўку:

— Мы армія колгасьнікаў...

На вуліцу высыпала ўся вёска.

Сёньня колгас „Чырвоны араты" паказвае сваю баявую гатоўнасьць уступіць у барацьбу за другі бальшавіцкі сеў.

Партыя, твой загад—выканаем!

40 сытых коней, 20 сакаўскіх плугоў, 2 радавыя сеялкі, 5 ударных брыгад.

— Весь з чым колгас „Чырвоны араты" прышоў да другой бальшавіцкай.

На трыбуне сакратар Лельчыцкага РК ЛКСМБ тав. Емін.

— Ударнікам колгасных палёў у дзень пробнага выхаду ў поле—шчырае комсамольскае вітаньне.

Старшыня колгасу, Хама Журовіч, гаворыць аб працы колгасу:

— Наш колгас хоць і малады, але за час свайго аднагадовага існаваньня прайшоў вялікі, цяжкі шлях. Пры організацыі, у колгас уступіла восем гаспадарак, рэштка вёскі недаверліва глядзела на сьмельчакоў.

Зараз колгас кожны дзень прымае ўсё новае і новае папаўненьне. Наша баявая задача—яшчэ шырэй разгарнуць вярбоўку ў колгас, замацаваць гаспадарчую моц колгасу, правільна раставіць свае сілы, організаваць працу так, каб кожны колгасьнік ведаў свой баявы абавязак у час вясновага севу.

Перад намі стаіць сёньня задача праверыць сваю гатоўнасьць, праверыць як мы выканалі рашэньне партыі і 6-га зьезду саветаў аб організацыі працы ў колгасах.

Старэйшыя брыгадзіры 5 брыгад адзін за адным рапартавалі на мітынгу пра абавязкі і пляны сваіх брыгад у час вясеньняга севу.

Пробны выезд паказаў, што колгас на баявому гатоў да правядзеньня бальшавіцкага севу.

Загад партыі будзе выкананы!

Брыгадзір „Ч.З."
С. Куцанаў.



Брыгадзір Журовіч правярае гатоўнасьць да пробнага выезду

Да другой гадавіны соцспаборніцтва

У першых радох соцыялістычнага будаўніцтва



Тэлефон прынёс вестку:

Прамфінплян па кравецкай фабрыцы імя Валадарскага выкананы 28-II г. г. а 9 гадз. увечары.

Гэта вынік штодзённай ударнай працы ўсяго колектыву фабрыкі.

Організаваны на ф-цы маладзежны комсамольскі агрэгат паказаў прыклад сапраўды ўдарнай працы на фронце выкананьня прамфінпляну.

Праца комсамольскага агрэгату ўдарнай ф-кі, якая датэрмінова выканала прамфінплян, зьяўляецца прыкладам для ўсяго комсамолу.

На здымку. Штаб соцспаборніцтва і ўдарніцтва малдзежнага агрэгату ф-кі імя Валадарскага.

Опэрацыйная зводка

Змагаіша за бальшавіцкі фінплян

Вушацкая і Слуцкая організацыі ня далі баявых тэмпаў па выкананьню соцдагавору з Украінай

Перадавыя, падцягнеце адсталых!

У соцумове з комсамолам Украіны беларускі комсамол узяў на сябе рад конкрэтных абязкаў у барацьбе за выкананьне фінпляну.

Зьвесткі з месц сьведчаць аб тым, што рад організацый, пасобных комсамольскіх ячэек яшчэ не пераключыліся на ажыцьцяўленьне ўзятых абавязкаў.

Злачынная бязьдзейнасьць Вушацкага РК ЛКСМБ, зрыў плянаў мобілізацыі сродкаў у раёне за першы квартал сьведчаць аб наяўнасьці опортуністычных адносін да справы мобілізацыі сродкаў.

Ёсьць факты добрай ініцыятывы. Неабходна раўняцца на перадавых.

Халопеніцкая організацыя па-ўдарнаму ажыцьцяўляе прынятыя самаабавязацельствы.

Ударным выкананьнем плянаў мобілізацыі сродкаў, высоўваньнем і выкананьнем сустрэчных плянаў, узьняцьцем актыўнасьці працоўных і сялянскіх мас—забясьпечым выкананьне фінпляну.

Форсаваць тэмпы выкананьня

СЛУЦАК. Комсамольская ячэйка Слуцкай школы колгаснай моладзі ўжо ператварыла ў жыцьцё лёзунг: „Кожны комсамолец — укладчык ашчадкасы".

Зараз усе комсамольцы зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкасы.

На сходзе ячэйкі, пры ўдзеле беспартыйнай моладзі школы, быў узяты абавязак выканаць і перавыканаць атрыманае заданьне і завербаваць укладчыкаў на 1.000 р. На сёньня заданьне выканана на 270 руб. Дадаткова праведзена падпіска на пазыку „5-цігодка ў чатыры гады," якая дала 310 руб. Распаўсюдзілі на 15 руб. білетаў ОЗЕТ-лётарэі.

П. Вяроўка

Выступаем з сустрэчным

Халопенічы.—Халопеніцкая організацыя комсамолу прыступіла да рэалізацыі соцдагавору паміж комсамольскай організацыяй Беларусі і Украіны.

Халопеніцкі РК КСМ высунуў сустрэчны плян мобілізацыі сродкаў. Замест дадзенага заданьня ў 30.000 рубл. на год і 9.000 на першы квартал ён узяў 40 тысяч руб. на год і 10 тысяч рублёў на першы квартал бягучага году.

Каб пасьпяхова выканаць высунуты сустрэчны плян, распачата масавая праца.

Кожная ячэйка вылучае спэцыяльнага ўпаўнаважанага і 2-х вярбоўшчыкаў для сталай працы, па вярбоўцы ўкладчыкаў. Комсамольскія ячэйкі прымацоўваюцца да ашчадкас.

Халопеніцкая комсамольская організацыя ўзяла на сябе абавязак—не пазьней 1-га мая організаваць комсамольскае ўзорнае аддзяленьне ашчадкасы.

Комсамольская організацыя Халопеніч павінна па-ўдарнаму ўзяцца за практычнае ажыцьцяўленьне высунутых мерапрыемстваў.

Давесьці заданьне да ячэек

Вушачы. — Вушацкай організацыі комсамолу дадзена заданьне па мобілізацыі сродкаў у 25 тыс. руб. на 1-шы квартал.

Атрымаўшы кантрольнае заданьне, Вушацкі РК КСМ разам з райашчадкасай разьмеркаваў яго па сельскіх ячэйках, але не давёў да ячэек.

Мінуў першы квартал, а практычнай працы комсамолу ў галіне фінпляну яшчэ няма. Ня ўсе комсамольцы—укладчыкі ашчадкасы, РК КСМ вынес пастанову скласьці брыгаду лёгкай кавалерыі для праверкі ходу выкананьня соц, умовы. Але і гэтая пастанова засталася на паперы.

Зараз мобілізацыяй сродкаў насельніцтва займаецца выключна апарат ашчадкасы, а комсамольская організацыя злачынна абыходзіць гэты важнейшы вучастак працы.

Сыгнал.

Кожны комсамолец--колгасьнік

Мы дрэнна выконваем гэты лёзунг

У найкарацейшы тэрмін зрабіць пералом у ажыцьцяўленьні гэтага рашэньня IX зьезду ЎсеЛКСМ

ЦК УсеКП(б) у сваёй дырэктыве парторганізацыям падкрэсьліў, што ў сучасны момант рашаючымі задачамі ў падрыхтоўцы дасяўбы зьяўляюцца: **сканчэньне збору насенных і фуражных фондаў колгасаў, праваздзеньне зьдзельшчыны ў колгасах і саўгасах, ліквідацыя абязьлічкі ў адносінах выкарыстаньня трактароў і сельска-гаспадарчых машын і завяршэньне работы па кантрактацыі.** Выходзячы з гэтага, комсамольскія організацыі павінны прыняць самыя рашучыя, энэргічныя захады для таго, каб выканаць у тэрмін гэтыя задачы. Трэба дабіцца таго, каб устаноўленыя партыяй для сканчэньня кантрактацыі збожжавых да (15-га красавіка і лёну да 5-га мая) тэрміны і перавод колгасаў на зьдзельшчыну былі своечасова выкананы. Трэба дабіцца сапраўднай рэалізацыі рашэньняў X зьезду ЛКСМБ аб пагалоўным уцягненьні ўсіх комсамольцаў у колгасы, у першую чаргу і ў самы кароткі тэрмін, у раёнах суцэльнай колектывізацыі і безадкладнага стварэньня ініцыятыўных груп з комсамольцаў, бядняцка-серадняцкай моладзі і дарослага насельніцтва па організацыі колгасаў у раёнах, не ахопленых яшчэ суцэльнай колектывізацыяй.

Прымеце выклі[к]

Для ажыцьцяўленьня рашэньня комсамольскіх зьездаў і ў сувязі [з] юбілеем „Чырвонай Зьмены", ячэйк[а] вёскі Старыя Стайкі організавал[а] колгас імя газэты „Чырвоная Зьме[на]". У колгас уступіла 19 беднят[ц]ка-серадняцкіх гаспадарак і прыня[]та 6 новых членаў.

Колгас скончыў абагуленьне на[]сеньня, інвэнтара і цягавай сілы. Комсамольцы разам са сваімі баць[]камі, першымі ўвайшлі ў колгас.

Ячэйка выклікае ўсе іншыя ком[]самольскія ячэйкі Копыскай органі[]зацыі пасьледваць яе прыкладу.

Аднаасобнік—сэкратар комунараўскай ячэйкі

У Паражырскім сельсавеце, Сьмілавіцкага раёну ёсьць комуна імя „Фрунзе". У гэтай комуне—комсамольская ячэйка, але гэта толькі адна назва.

Комсамольцы ня толькі не падаюць прыкладаў працоўнага парыву і энтузіязму, але дзейнасьцю сваёй разлагаюць астатніх комунараў: працоўная дысцыпліна пала да пагражаючых памераў.

Прагулы комсамольцаў лічаць тут зусім звычайнай зьявай. Бываюць выпадкі прагулаў на 5 дзён узапар.

Насьценгазэта ў комуне не выдаецца. Комсамольцы нават і ня думаюць аб выпуску газэты.

Ячэйка яшчэ не абмеркавала пытаньня аб удзеле комсамольцаў у бальшавіцкай вясьне.

Комсамольцы не змагаюцца за ліквідацыю гаспадарчых прары[в]аў у комуне. А недахопаў шмат. З-за надбайнасьці і бязьдзейнасьці падохла каля 60 сьвіней, пачынаюць хварэць цяляты.

Сэкратаром комсамольскай ячэйкі комуны зьяўляецца аднаасобнік Баркун. За няздбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў ён быў зьняты з працы ў Лясьнікоўскім коопэратыве. Зараз гэты самы Баркун працуе ў сельсавеце ў якасьці рахункавода. Ячэйкай Баркун ня толькі ня кіруе, але разлагае яе.

Райком КСМ ведае аб тым, але дагэтуль ніякіх мер на прыняў.

Д. Гіладзі

Апраўдаць назву шэфа

Ужо больш месяца таму назад комсамольская ячэйка будвучу пры Белжылсаюзе, сумесна з падшэфнай ячэйкай 5-й роты 8-скага стралковага палка, узяла шэфства над прыгарадным колгасам імя Сталіна. Прыняцьце шэфства прайшло вельмі ўрачыста. Шэфы шмат абяцалі колгасу, але... абяцаньні засталіся толькі на словах.

Г.

Па форме колгасная...

Станькаўская комсамольская ячэйка Койданаўскага раёну па форме лічыцца пры колгасе імя „Леніна", але на сутнасьці большасьць комсамольцаў—па-за колгасам. Комсамольцы ня прымаюць ніякага ўдзелу ў колектывізацыі і ільназагатоўках. Ніякай работы па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы ячэйка не праводзіць.

Рэшка

Узялі на буксір

Комсамольская ячэйка ф-кі імя Вароўскага" (Сураскі раён) узяла на буксір комсамольскія ячэйкі пры колгасах „Чырвоны Араты" і „Чырвоны Кастрычнік", якія пасёньня не праводзілі ніякай работы па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы. Для дапамогі ў рабоце ячэек высланы спэцыяльныя брыгады.

Тоўсьцік.

Раўнаньне на лепшых

Слуцак. (*Па тэлефону*). *Пры актыўным удзеле комсамольскай ячэйкі колгасу „Леніна", склад яго вырас з 7 гаспадарак да 50. Ячэйка колгасу „Чырвоная зорка" павялічыла лік гаспадарак у два разы—з 12 да 24. Гэтая-ж ячэйка організавала колгас „Чырвоная сьлёўка" з 23 гаспадарак.*

Ячэйка колгасу „КІМ" дала сустрэчны плян вясеньняй, якім прадугледжана пашырыць плошчу тэхкультур на 20 га.

Побач з ячэйкамі, якія стаяць на чале колгаснага руху, ёсьць, напрыклад, Стараўская, якая налічвае 15 комсамольцаў, а з іх толькі два колгасьнікі.

Такія паказчыкі мае і Некрашэўская.

Прыбытак.

Пасьля зьмены опортуністычнага кіраўніцтва

У студзені месяцы бюро Любаньскага РК ЛКСМ вынесла суровую вымову Любаньскай ячэйцы за бязьдзейнасьць у колектывізацыі. Пасьля гэтага ячэйка зьмяніла свой твар. Яна па-сапраўднаму павярнулася тварам да колектывізацыі. Калі некалькі месяцаў таму назад у сельсавеце ня было ніводнага колгасу, дык зараз іх тры. Колгасы былі організаваны выключна па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі. Колгас „Комсамолец" налічвае 45 гаспадарак, „Чырвоная Зьмена"—25 і „Ударнік"—23.

Ячэйка праводзіць сталую работу па ўмацаваньню гэтых колгасаў. Адначасова з гэтым, ячэйка, праз ініцыятыўныя групы, праводзіць работу па організацыі новых і прыліву ў старыя колгасы.

Макарэвіч

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599